акцыянальна-дэлібератыўным, радзей – акцыянальна-аб’ектным непераўтваральным і акцыянальна-аб’ектным пераўтваральным, а таксама дынамічна-лакатыўным.

Вышэйпералічаныя структурна-семантычныя мадыфікацыі ў эліпсаваных адзінках выконваюць шырокі дыяпазон функцый мастацкага твора.

## Літаратура


1. Анталогія беларускай паэзіі : у 3 т. – Мінск : Маст. літ., 1993. – Т. 3. – 623 с.
2. *Танк, М.* Сонечны гадзіннік : вершы ; для ст. шк. узросту / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 2021. – 118 с.
3. *Танк, М.* Паслухайце, вясна ідзе! : вершы, балады, паэмы / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 333 с.
4. *Чайка, Н. У.* Тыпалогія эліпсіса ў сінтаксічнай сістэме беларускай мовы : манаграфія / Н. У. Чайка. – Мінск : БДПУ, 2012. – 331 с.


*М. У. Мікуліч (Беларусь)*

# МАКСІМ ТАНК І ЯГО ПАЭЗІЯ

Творчыя людзі – пісьменнікі, мастакі, кампазітары, акцёры – асобы амбіцыйныя. Як правіла, яны прытрымліваюцца высокай думкі пра свае здольнасці, вынікі сваёй працы. Максім Танк тут выглядаў вялікім, слаўным, мілым выключэннем. Колькі разоў ён мне гаварыў пра тое, што хоча перапісаць паэму «Нарач», бо яна яму не ўдалася, перапрацаваць многія свае вершы, бо яны слабыя. І гэта пры тым, што паэму «Нарач» даўно высока ацанілі айчынная і замежная (польская, літоўская, руская, украінская і інш.) крытыка і літаратуразнаўства, а пра такія «слабыя» вершы маглі б толькі марыць многія сучасныя беларускія паэты. Яўген Іванавіч неаднаразова адзначаў, што я перахваліў яго ў сваёй манаграфіі «Максім Танк і сучасная беларуская лірыка» [1]. І гэта ў той час, калі кнігу ў цэлым вельмі прыхільна, без асаблівых крытычных заўваг прынялі нашы спецыялісты. А чаго варта ацэнка паэтам сваёй даверасняўскай творчасці, дадзеная ім у дзённікавых нататках «Лісткі календара». «З жахам агледзеўся, што мне мінула 27 год! – запісаў ён 29 верасня 1939 года. – А ў мяне толькі некалькі зборнікаў вершаў, сярод якіх 75 працэнтаў слабых, 20 працэнтаў – сярэдніх і толькі 5 працэнтаў – добрых. Няма чым хваліцца» [2, с. 328].

Знайдзіце сёння хоць аднаго беларускага літаратара з такімі ці блізкімі да іх думкамі пра сябе.

Мы ведаем, што М. Танк адмаўляўся ад усіх пасад, якія яму прапаноўвалі: і ад пасады старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў, і ад пасады старшыні Вярхоўнага Савета БССР, і ад пасады віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук. Адмаўляўся таму, што хацеў засяродзіцца на творчай працы, якая прыносіла яму вялікае

маральнае задавальненне. Як сведчаць родныя паэта, кожнаму свайму ўдаламу вершу, кожнай мастацкай знаходцы ён радаваўся, як дзіця. Аднак сціпласць, сумленнасць і адказнасць Танка высока цаніла рэспубліканскае кіраўніцтва і яму ў большасці выпадкаў удавалася пераканаць паэта ў неабходнасці згадзіцца з той ці іншай кадравай прапановай, а фактычна – з рашэннем зверху.

Будучы галоўным рэдактарам часопіса «Полымя», М. Танк заўсёды выкрэсліваў сваё імя ў матэрыялах, дзе яно фігуравала ў кантэксце пахвалы і кампліментаў. Лічыў, што друкаваць іх у такім выглядзе – не зусім карэктна для кіраўніка выдання. Свае вершы ў часопісе паэт змяшчаў толькі раз на год, не часцей.

Уявіце сабе, ён саромеўся насіць свае дзяржаўныя ўзнагароды, саромеўся таго, што іх у яго шмат. Ніхто ніколі не чуў ад М. Танка, што ён з'яўляецца Героем Сацыялістычнай Працы, акадэмікам Акадэміі навук Беларусі. «Ён быў такі, – прызнаваўся падчас адной з нашых сустрэч і гутарак сын народнага паэта Максім Яўгенавіч, – што ніколі ўперад не палезе, ніколі сам дзесьці ў прэзідыуме не сядзе. Гэта толькі калі абставіны вымагаюць, калі пранумараваныя месцы, з указаннем прозвішчаў канкрэтных асоб…» [3].

Максім Танк неаднойчы раіў мне пісаць не так пра яго, як пра некаторых іншых літаратараў Заходняй Беларусі, у прыватнасці, пра Валянціна Таўлая, Сяргея Крыўца, Ганну Новік, якіх, на думку паэта, несправядліва забылі, пра ўдзельнікаў народна-вызваленчага руху, людзей таленавітых, сумленных і ахвярных. Яўген Іванавіч вельмі клапаціўся пра тых, з кім некалі разам уваходзіў у літаратуру, з кім плячо ў плячо працаваў у камуністычным падполлі. Пра заходнебеларускіх падпольшчыкаў М. Танк заўжды гаварыў цёпла, прачула, нават сентыментальна. Было бачна (ды ён і не скрываў гэтага), што яны для паэта – дужа дарагія людзі.

Несумненна, паказчыкам вялікай сціпласці М. Танка з'яўляецца той факт, што ён прасіў пахаваць яго не ў Мінску, а на Мядзельшчыне, на Слабадскіх могілках, дзе пахаваны яго родныя і блізкія, побач з маці і бацькам. У завяшчанні паэт прасіў хаваць яго без ардэноў, музыкі і прамоў, «як найсціплей, як хавалі і хаваюць спрадвеку ў нас усіх», не ставіць на магіле помнік, не надаваць яго імя ўстановам і памятным мясцінам.

У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва захоўваюцца сотні пісем да М. Танка ад жыхароў Беларусі (і не толькі) з просьбамі дапамагчы, заступіцца, абараніць і г. д. І фактычна ні адно з іх не засталося без адказу. Прафесар Пётр Кузюковіч, блізкі сваяк мастака, у сваіх успамінах «Проста добры чалавек» падкрэслівае: «Захапляла надзвычайная прастата і дабрыня славутага паэта, што дазваляла многім людзям з розных раёнаў Беларусі звяртацца да яго асабіста і пісьмова з просьбамі аб дапамозе і абароне. І я не ведаю выпадку, калі б ён каму адмовіў у гэтым» [4, с. 189]. М. Танк не дзяліў людзей на добрых і кепскіх і памагаў усім, хто да яго звяртаўся.

Ён быў вельмі дасціпным чалавекам, выдатным гумарыстам. Паэт любіў і ўмеў жартаваць і рабіў гэта з вялікай ахвотай. Дадзеная, вядома, прыродная якасць праяўлялася і ў яго стасунках і дачыненнях з калегамі па пяры і чытачамі,

і пры вырашэнні складаных пытанняў, звязаных з дзейнасцю Саюза пісьменнікаў Беларусі, пры выкананні дэпутацкіх абавязкаў, і непасрэдна ў мастацкай творчасці. М. Танк валодаў дарам з дапамогай тонкага дружалюбнага жарту разрадзіць самую напружаную сітуацыю, змякчыць канфлікт, зняць супярэчнасць, супакоіць і развеяць чалавека. Тут міжволі прыгадваецца цікавы ўспамін Івана Шамякіна з яго артыкула, прысвечанага 80-годдзю народнага паэта. «Пазнаёміліся мы ў снежні 1945 года, – прыгадваў Іван Пятровіч, – на першым пасляваенным пленуме Саюза пісьменнікаў. Які пленум! Сход! З 43 членаў саюза, што засталіся жывыя ад рэпрэсій і вайны, прысутнічала 42, Пімен Панчанка не дабраўся з Ірана. І мы, маладыя, чалавек 20. А гаварылі чатыры дні! Было што сказаць! Я пісаў ужо, што на Коласа, Крапіву, Лынькова, Танка, Броўку, Глебку, Куляшова глядзеў, як на Апосталаў таго Неба, на якое і я памкнуўся ўзабрацца. Прывучаны за пяць гадоў да армейскай субардынацыі, я баяўся загаварыць з «генераламі літаратуры». І во шчасце! – у час абеду Максім Танк сеў за наш стол. І – божа мой! – як ён зачараваў нас сваёй дэмакратычнасцю, народнасцю, дасціпнасцю. Мы плакалі і рагаталі з яго расказаў. Помню, што на пытанне аднаго з нас Яўген Іванавіч адказаў: «Як я пішу? У мяне ж двойня, хлопцы! Дзве дзяўчынкі – Іра і Вера. Адну я трымаю на правай руцэ, другую на левай, а ззаду на шыі вісіць Максім, сын. Побач жонка грыміць каструлямі і тазамі – пакой адзін. І я пішу… нагой, левай» [5, с. 6].

Нядаўна мне давялося гартаць свае старыя занатоўкі дароўных надпісаў Максіма Танка, зробленых на кнігах, якія ён прэзентаваў розным асобам. Яны ў поўнай ступені адлюстроўваюць адзначаную асаблівасць. «Дарагі Пятро! – пісаў ён, напрыклад, 30 красавіка 1964 года на тытуле свайго зборніка вершаў, звяртаючыся да Пятра Глебкі. – Прызнацца, баяўся пасылаць Табе гэты «Глыток вады». Каб не пакрыўдзіўся Ты і не падумаў, быццам я забыўся і не ведаю, што п’е мой кум. Зразумела, я не забыўся і помню, і, пры сустрэчы, знайду нешта лепшае і мацнейшае, як глыток вады. Максім Танк» [6]. А гэтыя радкі, адрасаваныя Максіму Лужаніну, знаходзім на тытуле кнігі «Збор калосся»: «Дарагі Максіме! Віншуючы Цябе са слаўным 80-годдзем, падумаў: што падарыць юбіляру? І ўспомніў, што ў нашы гады вельмі часта дакучае бяссоніца. Таму пасылаю Табе праверяны на чытачах сродак – гэты свой зборнік вершаў – з гарантыяй, што ён дапаможа справіцца з гэтым недамаганнем. З найлепшымі пажаданнямі Максім Танк. Мінск. 2/XI 1989 г.» [7].

Тонкая іронія і дасціпная ўсмешка спадарожнічалі паэту заўсёды. Чаго варты, напрыклад, наступны яго дзённікавы запіс, зроблены, здавалася б, у сувязі з надзвычай сур’ёзнай падзеяй: «Па тэлефоне П. М. Машэраў павіншаваў з прысваеннем мне звання Героя Сацыялістычнай Працы, за што я горача яму падзякаваў. Прызнацца, гэта высокае званне трэба было б, раней як некаторым з нас, прысвоіць старэйшым – Р. Шырме, К. Крапіве, М. Лынькову. Праўда, аднойчы, калі мы з І. Шамякіным аб гэтым гаварылі, Пётр Міронавіч запэўніў нас, што ён аб іх помніць. Былі яшчэ званкі ад А. Шыцікава, М. Зімяніна, ад сяброў, знаёмых... Сёння трэба паслаць віншавальныя тэлеграмы Бажану, Абашыдзе,

Гамзатаву, Грыбачову, Катаеву, Кажэўнікаву, Маркаву, Мусрэпаву, Палявому, Сіманаву, Яшэну.

Пішу тэлеграмы і думаю: няўжо ў нас столькі герояў у літаратуры?» [8, с. 268].

Жыццёвая біяграфія – гэта творчы лёс пісьменніка, ва ўсякім выпадку паэта. Яна мае вызначальную ролю ў станаўленні і развіцці яго мастацкай індывідуальнасці.

Яўген Скурко, будучы беларускі паэт Максім Танк, нарадзіўся па новым стылі 17 верасня 1912 года ў вёсцы Пількаўшчына Вілейскага павета Віленскай губерні, у царскай Расіі. Рушыўшы разам з бацькамі падчас Першай сусветнай вайны ў бежанства, ён з 1917 па 1922 год жыў у Савецкай Расіі, у Маскве. Вярнуўшыся на Радзіму, апынуўся ў Польшчы, паколькі яго родныя мясціны знаходзіліся ў складзе Заходняй Беларусі, якая паводле Рыжскага мірнага дагавора 1921 года адышла да гэтай дзяржавы. Пасля ўз'яднання Беларусі ў 1939 годзе Танк жыў у Савецкім Саюзе, а памёр у незалежнай Рэспубліцы Беларусь.

У школу малы Яўген Скурко пайшоў у бежанстве ў Маскве. Вывучаючы рускую мову і літаратуру, палюбіў творы Пушкіна, Някрасава, Гогаля, Горкага, некаторых іншых пісьменнікаў. Вярнуўшыся з уцякацтва, працягваў вучобу ў польскіх школах: спачатку ў Шкленікава, пасля ў Сватках. Тут ён пазнаёміўся з польскай класікай – Міцкевічам, Славацкім, Сянкевічам, Ажэшкай…

Беларуская кніга ўпершыню трапіла ў рукі Яўгена Скурко толькі ў 1925 годзе. Гэта быў беларускі каляндар, у якім увагу падлетка прыцягнулі сацыяльна і патрыятычна заангажаваныя вершы Янкі Купалы.

Тое, што М. Танк пазнаёміўся спачатку з рускай літаратурай, затым з польскай і толькі пасля з беларускай, абвастрыла ў ім пачуццё нацыянальнага, якое прывяло яго ў шэрагі актыўных удзельнікаў народна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. З першых сваіх крокаў у літаратуры ён развіваўся як вельмі беларускі паэт. Беларускі па самім тыпе мастацкай свядомасці, філасофіі творчасці, вобразным ладзе мыслення.

Малады Яўген Скурко вучыўся ў чатырох гімназіях, аднак ніводнай з іх не закончыў: Вілейскую рускую закрылі польскія ўлады, з Радашковіцкай беларускай і Віленскай беларускай ён быў адлічаны за непадпарадкаванне адміністрацыі і ўдзел у забастовачным руху пратэсту, а падчас навучання ў Віленскай рускай пачынаючага паэта непасрэдна ў класе арыштавала польская паліцыя і кінула на Лукішкі.

Антыномы і парадоксы жыццёвага лёсу Максіма Танка заключаюцца ў тым, што ён быў народным паэтам БССР, акадэмікам Акадэміі навук Беларусі, аднак не толькі не меў вышэйшай адукацыі, але і закончанай сярэдняй. У сваёй картачцы персанальнага ўліку члена Саюза пісьменнікаў у графе «Адукацыя» паэт указаў, што ў 1954 годзе закончыў Вячэрні ўніверсітэт марксізма-ленінізма пры Мінскім гаркаме КПБ.

М. Танк працаваў інструктарам ЦК камсамола Заходняй Беларусі, у легальных і нелегальных перыядычных выданнях, неаднаразова арыштоўваўся польскай дэфензівай і зняволькаўся ў турму. Усяго паэт адсядзеў на Лукішках каля трох

гадоў. У перыяд вайны ён служыў у франтавым друку, паскорана адаптаваўся да новых для яго савецкіх грамадска-сацыяльных умоў і парадкаў. Дарэчы, у канцы 1930-х гадоў былі рэпрэсаваны, высланы ў Сібір цёткі паэта па бацькавай лініі Соня і Поля з сем'ямі, якія жылі ў Савецкім Саюзе, а ў гады вайны пры не высветленых абставінах ад рук партызан загінула малодшая сястра Вера са сваім двухгадовым сынком. У пасляваенны перыяд Максім Танк працаваў на адказных дзяржаўных пасадах. На працягу 18 гадоў (з 1948 па 1966) паэт кіраваў вядучым беларускім літаратурна-мастацкім часопісам «Полымя», на працягу 24 гадоў (з 1966 па 1990) узначальваў на той час вельмі аўтарытэтную, сацыяльна значную і ўплывовую арганізацыю – Саюз пісьменнікаў Беларусі. 24 гады (з 1947 па 1971) ён з'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, 20 гадоў (з 1969 па 1989) – дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР. М. Танк працаваў старшынёй Вярхоўнага Савета БССР VI і VII скліканняў (1963–1971).

Такой жыццёвай біяграфіі не мае ніводзін пісьменнік у гісторыі новай беларускай літаратуры.

Сінтэз рэдкага чалавечага характару і яркага мастацкага таленту, а таксама ўнікальнай жыццёвай біяграфіі абумовіў вялікія творчыя здабыткі Максіма Танка.

Выхад першага зборніка вершаў «На этапах» (1936), дарэчы, адразу канфіскаванага польскай паліцыяй, зрабіў М. Танка зоркай першай велічыні на небасхіле літаратуры Заходняй Беларусі. Духоўна-мастацкая свядомасць паэта актывізавалася балючай думкай пра зняволены родны край, спакутаваную зямлю, прыгнечаны і занядбаны беларускі народ: «Хто пачуў тваю песню жалезную, / Хто астрожную скаргу пачуў? / Беларусь, твае далі бязмежныя / Ўскалыхнуць сваёй песняй хачу!» [9, с. 63] («Хто пачуў тваю песню жалезную…»).

Паэзія Максіма Танка вызначалася экспрэсіўнасцю светаадчування, свежасцю і вастрынёй мыслення, рамантызаваным выяўленнем суровага рэалізму часу: «Нарач, як мора, шуміць / і на бераг круты наступае, / Дыміць над выгарамі і над палямі туман. / З ветрам узняўшыся, кружыцца вывадак чаек, / Спуджаных скрыпам абозаў і звонам кайдан. / І чуваць, па-над намі / лятуць недзе гусі у вырай. / Развітальны іх крык патанае ў глухой лебядзе. / Ды балюча скрыпяць і галосяць калёсы па жвіры, / Па мядзельскім тракту / бясконцы этап наш брыдзе…» [9, с. 36] («Нарач, як мора…»).

Што мы бачым у гэтым вершы? Абшары Заходняй Беларусі. Закаваных у жалезныя кайданы, дарэшты знямоглых, але не скораных палітзняволеных пад канвоем гоняць па этапу. Першая страфа – звычайны лірыка-апавядальны эцюд, а далей: «І чуваць, па-над намі лятуць недзе гусі у вырай. Развітальны іх крык патанае ў глухой лебядзе…» Колькі тут тыповай жыццёвай праўды і драматызму, колькі высокай эстэтыкі чалавечага духу і ахвярнасці, колькі шчымлівай самоты, і як пра гэта глыбока і пранікнёна сказана паэтам! Ад цяжкіх дум і стомы лірычнаму герою няма як падняць вочы. Гусей ён не бачыць, а чуе. Натуральна, вобраз гусінага выраю сімвалізуе тут надзею, веру ў светлы пачатак. У вершы выявіліся вызначальныя рысы нашага нацыянальнага менталітэту, асаблівасці гістарычнага краявіду Беларусі. Здаецца, і ў цябе самога баліць душа ад таго, як

«скрыпяць і галосяць» тыя калёсы па жвіры на бясконцым пыльным мядзельскім гасцінцы.

Такой культуры перажывання і мыслення нельга навучыцца. Яе трэба выпакутаваць. М. Танк выпакутаваў!

Танкаўскія вершы «Нарач, як мора…» і «Спатканне» я заўсёды чытаю з даўкім камяком у горле, нейкім асаблівым душэўным утрапеннем, якое не праходзіць з гадамі. Успамінаецца тужлівы расказ паэта пра тое, як плакала маці Домна Іванаўна, калі яго, юнага падпольшчыка, забірала з роднага пількаўскага хутара польская паліцыя. Здзіўлялася, што яе сын-падлетак такі небяспечны для дзяржавы, плакала, спрабавала пацалаваць руку паліцыянта і прасіла не біць яго…

Паэзія М. Танка 1930-х гадоў – гэта паэзія чорных скіб, шурпатых далоняў, незагойных ран, стогнаў у катоўнях, паэзія гневу і бунту, смелага выкліку. Яна грунтавалася на тонкай назіральнасці і ўражлівасці, эмацыянальна-псіхалагічнай пранікнёнасці лірычнага героя, услаўленні высокіх праяў святла і красы ў прыродным свеце, грамадскім асяроддзі і душы чалавека. Рамантычная летуценнасць, душэўная высакароднасць спалучаліся ў ёй з унутранай адмабілізаванасцю, наступальнай бескампраміснасцю, рэвалюцыйным гартам, ахвярнай мужнасцю. Вершы паэта «На касагоры», «Чорныя скібы», «Адказ», «У маршы» і іншыя неслі гаркотную развагу, прысумленую споведзь, даверлівае прызнанне, але часцей – суцяшэнне і падтрымку, бадзёрасць і веру, гарачкаваты заклік, сведчылі трывалую сувязь з «бязмежным светам народнай героікі» (Р. Бярозкін). «Максім Танк гэта вельмі маладая, але сільная творчасьцяю індывідуальнасьць, – пісала ў 1936 годзе газета «Наша воля». – Ягоная творчасьць вырасла ў вастрогах і, вырваўшыся з турмы, заліла Зах. Беларусь. Творы Танка – гэта лявіна, гэта бурная хваля, якая парывае ўсіх, трасе ўсім і ламае ўсё. Танк можа стацца вялікім песьняром Беларусі, калі не забудзе аб найважнейшай умове – згушчаць чым найбольш думку на палатне вобразу» [10, с. 2].

Вялікае месца ў творчасці паэта належала такім ёмістым сацыяльна-маральным катэгорыям, як матчына песня, родныя загоны, каласістае гора, этапныя дарогі, звон кайданаў, муры і краты, жалезны вырай, вясна-перамога і інш. Яны ўвасаблялі характэрныя рысы грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі, духоўна-сацыяльнай свядомасці народа. Гэтыя катэгорыі раскрывалі вызначальныя асаблівасці беларускага нацыянальнага лёсу.

Кнігі М. Танка «На этапах», «Журавінавы цвет» (1937), «Нарач» (1937) і «Пад мачтай» (1938), вершы і паэмы сталіся лепшымі ў заходнебеларускай літаратуры. Творчасць паэта сведчыла жыццястойкасць беларускай нацыі, яна сцвярджала моц і сілу народа, які жыў ідэямі аб'яднання, сацыяльнай і нацыянальнай волі, годнага ўпарадкавання сваёй Радзімы, раскрывала прыгажосць яго высакароднай душы.

Але на поўную сілу творчая індывідуальнасць Максіма Танка раскрылася ў пасляваенны перыяд.

У 1960 – 1980-я гады паэт сцвердзіў у беларускай літаратуры такія ідэйна-мастацкія напрамкі, як паэтызацыя спаконвечных зямных асноў народнага жыцця,

духоўна-маральных каштоўнасцяў працоўнага асяроддзя, працы хлебароба, аратага, сейбіта, філасофска-аналітычнае асэнсаванне складанай і супярэчлівай дыялектыкі прыватных з'яў і гістарычных працэсаў, шматстайнай прычынна-выніковай сувязі асобы і грамадства, раскаванасць мастацкага мыслення, набліжэнне мовы паэзіі да мовы прозы, умоўна-асацыятыўная вобразнасць і г. д.

Зборнікі вершаў М. Танка «Мой хлеб надзённы» (1962), «Глыток вады» (1964), «Перапіска з зямлёй» (1967), «Хай будзе святло» (1972), «Дарога, закалыханая жытам» (1976), «Прайсці праз вернасць» (1979), «За маім сталом» (1982) і іншыя вызначаюцца арганічным спалучэннем маштабнасці гістарычнага мыслення, шырыні духоўна-сацыяльных далягляд аў і пластыкі прадметнага аналізу, прыватнай канкрэтыкі з'яў і рэчаў. У іх філасофска-аналітычная медытацыя суседнічае з грамадзянска-патрыятычным характарам мастацкага дыскурсу, прамоўніцка-публіцыстычны пафас дапаўняецца тонкай іроніяй і знішчальнай сатырай.

Зборнік вершаў паэта «Каб ведалі» быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР (1948), зборнік «Мой хлеб надзённы» – Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Янкі Купалы (1966), а кніга паэзіі ў перакладзе на рускую мову «Нарочанские сосны» (Масква, 1977) – Ленінскай прэміяй (1978).

М. Танк пакінуў пасля сябе дзясяткі арыгінальных паэтычных кніг, кожная з якіх з'яўляецца этапнай у гісторыі беларускай літаратуры XX ст. Паэту належаць творы непрамінальнай красы і надзвычайнай эмацыянальнай сілы ўздзеяння: «Спатканне», «Паслухайце, вясна ідзе…», «Песня кулікоў», «Адказ», «Тры песні», «Родная мова», «Каб ведалі», «Люцыян Таполя», «Антон Нябаба», «Рукі маці», «Станцыя Княгініна», «Ave, Maria», «Мне здаецца», «Калі горыччу перапоўнена сэрца…» і іншыя. Без ніякіх сумненняў, яны зрабілі б гонар любой нацыянальнай культуры свету, упрыгожылі б любую, самую адмысловую, элітарную анталогію.

17 верасня 1994 года, у апошні раз адзначаючы дзень свайго нараджэння, М. Танк напісаў глыбока споведны верш «Калі горыччу перапоўнена сэрца…» Яго немагчыма чытаць з унутраным спакоем, неяк адстаронена-індэферэнтна аналізаваць у адпаведнасці з усталяванымі літаратуразнаўчымі крытэрыямі, нормамі і прыёмамі – задума твора, лірычны герой, характар вобразнасці і г. д. Прыгадаеш верш у памяці – і перахопліваецца дыханне, у душы пасяляюцца боль і туга. Колькі ў ім глыбіннай жыццёвай філасофіі і сэнсу, нечага да канца невыказнага, падсвядомага, таго, што нязменна прысутнічае ў біялагічнай і сацыяльнай прыродзе і заўсёды будзе прыцягваць у асобе чалавека, яго ўнутраным свеце, паводзінах і ўчынках.

Ледзь не ўпрытык наблізіўся жыццёвы далягляд, як ніколі, нізкім і змрочным стала неба над галавою і абыякава-раўнадушным дзень на двары. У душы настойліва пляскочуць туга і горыч... Свой драматычны жыццёвы стан, незайздросныя перспектывы будучыні паэт праецыраваў на лёс нарачанскай сасны-адзінотніцы: «Калі горыччу / перапоўнена сэрца / І дыхаць і жыць немагчыма, здаецца, / Заўжды ўспамінаю / сасну / над абрывам, / Падсечаную нарачанскім прылівам. / Сасну, што трымаецца рэшткай карэння / За грунт, / а вяршыняй сваёю высокай / Да сонечнай цягнецца / высі праменнай, / Над тонню смяротнай калыша аблокі» [11, с. 310].

Мы ведаем, у самыя скрутныя часы М. Танк заўсёды звяртаўся да вобразаў Радзімы, народа, нарачанскага краю, маці, хлеба, песні. А яшчэ – да вобраза сасны, які ў яго свядомасці быў духоўна набліжаны да папярэдніх, сімвалізаваў Бацькаўшчыну, яе ўнутраную трываласць перад нягодамі і выпрабаваннямі і стрыманую знешнюю красу. Гэтыя вобразы гаілі яго сэрца, пасаблялі выстаяць, пераадолець цяжкасці, зараджалі ідэямі жыццесцвярджэння і аптымізму, натхнялі на творчасць.

Адчуваючы на сабе халоднае дыханне смяротнай тоні, трымаючыся «за грунт» «над абрывам» толькі «рэшткай карэння», сасна тым не менш імкнецца ўзнесці сваю макушку да сонца, яго шчодрай промневай высі. Вобраз надзвычайнай зместавай ёмістасці і сілы мастацкага ўздзеяння! Будучыня сасны прадвызначана, дрэва марудна, але няўхільна гіне, сілы пакідаюць яго, жыццё трагічна падбіта. Заключны радок верша – «Над тонню смяротнай калыша аблокі» – як канцовы акорд у якім высокамастацкім музычным творы. Ён пасяляе ў душы адчай, роспач і ў той жа час захапленне, трывогу, спачуванне і адначасова радасць. А перадусім, канечне, роздум – засяроджаны роздум над жыццём, яго логікай і сэнсам, хуткаплыннасцю і вечнасцю, і над сабою ў ім.

Жыццё – гэта яшчэ адзін скразны вобраз у творчасці М. Танка.

Верш «Калі горыччу перапоўнена сэрца...» варта ўспрымаць як своеасаблівы вертыкальны зрэз чалавечага быцця. Жыццё – гэта пачатак і канец, духоўнае і матэрыяльнае, малое і вялікае, светлае і цёмнае, высокае і нізкае... Гэта карэнне і вяршыня, грунт і паднебная высь, тонь і аблокі... Стрыжнёвыя словы верша – сэрца, жыць, сасна, карэнне, грунт, вяршыня, высь паднебная, тонь смяротная – своеасаблівыя знакавыя коды чалавечага існавання на зямлі.

Творчасць М. Танка аказала і аказвае вялікі ўплыў на развіццё беларускай літаратуры, у прыватнасці, паэзіі. Пад яе дабратворным уздзеяннем узрасло імкненне нашай лірыкі пасляваеннага перыяду да шырыні і яркасці мастацкага мыслення, пластычнай выяўленчасці і прасторнасці. Гэта засведчылі ідэйна-эстэтычныя пошукі А. Вялюгіна, М. Аўрамчыка, некаторых іншых паэтаў. У 1960-я гады пераемнікамі традыцый выдатнага мастака выступілі прадстаўнікі «філалагічнага» пакалення, блізкія да яго характарам лірычнага «я», мастацка-стылявымі асновамі творчасці. Насычаная малюнкавасць, рамантычна-экспрэсіўная вобразнасць, гістарызм мыслення аб'ядноўваюць з Танкавымі раннія творы У. Караткевіча, пластычнай выразнасцю, «зрокавай кранальнасцю рэчаў», шматузроўневым суаднясеннем з'яў тыпалагічна набліжаны да М. Танка Р. Барадулін, Я. Сіпакоў, П. Макаль і інш. Паэзія М. Танка, у прыватнасці, форматворчасць мастака, стылістычныя адкрыцці аказалі значны ўплыў на пошукі беларускай лірыкі ў галіне паэтыкі, на характар архітэктонікі, распрацоўку неметрычных памераў. Прыкладна пачынаючы з 1960-х гадоў у ёй развіваюцца тэндэнцыі, звязаныя з імкненнем да размоўнасці інтанацыі, «раскаванасці рытмарада», разняволення паэтычнай формы. Канвенцыйны верш дапаўняецца дольнікам, тактавіком, рознымі мадыфікацыямі верлібра, кожная з якіх, будучы тыпалагічна набліжанай да танкаўскай, у той жа час сведчыць пра своеадметнасць пошукаў аўтара.

Многія беларускія паэты ўспрымаюць М. Танка як заканадаўцу ў плане сацыяльна-светапогляднага, філасофскага асэнсавання працэсаў рэчаіснасці. Абапіраючыся на вопыт выдатнага мастака, аб чым сведчыць пераклічка канкрэтных вершаў, яны вядуць актыўныя пошукі ў напрамку пашырэння інтэлектуальных даляглядаў творусці, развіцця шматмернай умоўнасці, гістарызму мыслення і інш. Падкрэсленая лагізаванасць светаадчування, грамадзянская іншасказальнасць, падтэкставая насычанасць, тыпалагічна блізкія да танкаўскага ўспрыняцця жыцця, вызначаюць творы А. Вярцінскага, А. Разанава, А. Сыса. Творчасць М. Танка разглядаецца многімі нашымі паэтамі як арыенцір у пошуку адказаў на пытанні, якія ставяць час, яго духоўна-гуманістычныя супярэчнасці, абумоўленыя грамадска-сацыяльнымі зменамі і зрухамі. Са зваротам да танкаўскага вопыту шмат у чым звязана ўзмацненне ў беларускай паэзіі канца XX – пачатку XXI ст. гуманістычнага пачатку, грамадзянскасці і патрыятызму, імкненне да паглыбленага асэнсавання духоўных каштоўнасцяў чалавека, паэтызацыі народнай самасвядомасці, зямных першаасноў і інш.

М. Танк як паэт, асоба, безумоўна, з'яўляўся дзяржаўным чалавекам. Але яго мастацкі талент быў настолькі магутны, яркі і шматгранны, што не ўкладваўся ў тагачасную дзяржаўна-ідэалагічную сістэму і палітыку. Ён не вельмі паддаваўся абмежаванням, рэгламентацыі і уніфікацыі, бо адпачатку развіваўся пад кутом высокай духоўнасці і маралі, дабрыні і чалавечнасці, праўды і справядлівасці, красы і гармоніі. М. Танк хоць і з'яўляўся шчырым камуністам, членам ЦК КПБ, аднак не дужа імкнуўся да сцвярджэння і рэалізацыі камуністычна-партыйных ідэалагем, прынцыпаў і норм жыццядзейнасці, не столькі паэтызаваў іх, колькі маніфеставаў ці канстатаваў. Камуністычныя ідэі і перакананні арганічна спалучаліся ў яго духоўнай свядомасці з нацыянальна-патрыятычнымі, больш за тое – грунтаваліся на апошніх. Можна смела адзначыць: М. Танк найперш быў беларусам, а пасля камуністам, ён, як ніхто іншы, выдатна ведаў цану народна-патрыятычным традыцыям і каштоўнасцям. Падчас адной з нашых гутарак летам 1995 года паэт разважаў: «Ідэя беларушчыны... Я хачу ўкрапіць яе ў свае творы, каб яна была як вітаміны ў ежы: не так вылазіла са сваімі вушамі, але каб дзейнічала... Раней пісалі якія-небудзь слабенькія вершы, але, калі ў канцы ўспаміналі Сталіна, яны ішлі на першых старонках. Вось што самае небяспечнае – каб мы нашае святое слова не зацёрлі... Я баюся, каб не стала разменным тое, за што змагаемся. Ад частага ўжывання, бяздумнага, лёгкага. Ужо калі ўспомніў, то ўспомні, каб яно засталося ў памяці не толькі тваёй...» [12, с. 294].

Што тут можна дадаць ці ўдакладніць…

Незвычайныя ўражанні засталіся ад нашых сустрэч і гутарак. Максім Танк, здаецца, ніякіх ідэйных і жыццёвых прынцыпаў не раскрываў і не бараніў, ні на чым асабліва не настойваў, нікога надта не хваліў, але нікога моцна і не ганіў. Ён не імкнуўся зрабіць уражанне, не імкнуўся здзівіць мяне ні веданнем рэдкіх падзей і фактаў, ні глыбінёй і арыгінальнасцю аналізу грамадска-культурных працэсаў, ні дакладнасцю і трапнасцю іх характарыстык і ацэнак. Памятаецца, Яўген Іванавіч ні на што не скардзіўся, ні аб чым не шкадаваў і нікога ні аб чым не прасіў.

А былі ж гэта надзвычай складаныя 1990-я гады… Усё, пра што ён расказваў, грунтавалася на нейкай адмысловай дыялектыцы супрыроднасці і было скіравана не на адасобленасць, а на аб'яднанне. Яно несла магнетычную энергетыку цяпла, дабра і мудрасці і засталося ў маёй душы назаўсёды. Гэта быў роздум чалавека, які прайшоў «праз агонь, І воды І медныя трубы…» (верш «Я спытаў чалавека…»). К таму часу паэт ужо страціў сястру Людмілу Іванаўну, дачку Веру і жонку Любоў Андрэеўну, а таксама ўсіх сваіх асноўных сяброў і таварышаў. Ад яго веяла спакоем і самадастатковасцю, жыццёвай трываласцю і надзейнасцю, веліччу народнага духу і волі.

Максім Танк – класік беларускай літаратуры, выдатны еўрапейскі паэт. Ён належыць да ліку вельмі нямногіх нашых пісьменнікаў, каму магла быць прысуджана знакамітая Нобелеўская прэмія па літаратуры. Па сіле і размаху прыроднага дару, ідэйна-мастацкага мыслення, сцвярджэнні спаконвечных асноў народнага жыцця, па адмысловай якасці і самабытнасці рэалізацыі ў слове высокай эстэтыкі чалавечага духу Максім Танк не мае сабе роўных у беларускай паэзіі. Па гэтых асаблівасцях ён пераўзыходзіць многіх на сёння культавых заходніх аўтараў. М. Танк – самы паважаны і аўтарытэтны беларускі паэт пасляваеннага часу ў асяроддзі еўрапейскіх літаратурна-мастацкіх эліт, аб чым сведчаць, напрыклад, выказванні Чэслава Мілаша, Караля Вайтылы (Яна Паўла ІІ), Марка Шагала, якія яго ведалі асабіста.

Гэта быў дар ад Бога. Унікальны чалавек, непаўторны паэт, таленавіты арганізатар літаратурна-мастацкага працэсу, каларытная, дзяржаўная асоба. Ён жыў самымі светлымі думкамі і ідэямі, якімі можа жыць чалавек, і пакінуў яркі след у душах і сэрцах сваіх суайчыннікаў, у гісторыі роднай Беларусі.

У плане ўвекавечання памяці народнага паэта Беларусі, лаўрэата Ленінскай прэміі, Героя Сацыялістычнай Працы, акадэміка Максіма Танка ў нас многае зроблена. Аднак шмат што яшчэ і патрэбна зрабіць: неабходна адкрыць музей паэта – пакуль дарэшты не пагубляліся рэдкія матэрыялы, рэчы і прадметы, звязаныя з яго жыццём і творчасцю, устанавіць у Мінску помнік выдатнаму мастаку і грамадзяніну, патрыёту роднай зямлі, які б адпавядаў глыбіні і маштабнасці яго асобы, вялікаму ўкладу ў дзяржаўна-культурнае будаўніцтва Беларусі, а таксама выдаць шматтомны збор твораў на рускай мове, каб яго паэзія пайшла да самага шырокага чытача, у тым ліку і праз далейшыя пераклады на вядучыя мовы свету.

## Літаратура


1. *Мікуліч, М. У.* Максім Танк і сучасная беларуская лірыка / М. У. Мікуліч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 191 с.
2. *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 9 : Лісткі календара. Дзённікі (1941–1959). – 2009. – 592 с.
3. Цыт. па матэрыялах, якія захоўваюцца ў аўтара.
4. *Кузюковіч, П.* Проста добры чалавек / П. Кузюковіч // Максім Танк. На камні, жалезе і золаце : успаміны, эсэ, прысвячэнні. – Мінск, 2012. – С. 189.

5. *Шамякін, І.* Паклон чалавеку і паэту / І. Шамякін // Літ. і мастацтва. – 1992. – 11 верас. – С. 6.
6. *Танк, М.* Глыток вады : вершы / М. Танк. – Мінск : Беларусь, 1964. – Цэнтр. навук. бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – КГ. 2978.
7. *Танк, М.* Збор калосся : вершы (1983–1988) / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1989. – Цэнтр. навук. бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Б – ХХ. – Нр. – 7007.
8. *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 10 : Дзённікі (1960–1994). – 2010. – 919 с.
9. *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 1 : Вершы (1930–1939). – 2006. – 374 с.
10. Ор. Вечар беларускай паэзіі і песьні / Ор // Наша воля. – 1936. – 20 сакавіка. – С. 2.
11. *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 6 : Вершы (1983–1995). – 2008. – 454 с.
12. *Мікуліч, М.* Максім Танк. Талент, заручаны з небам / М. Мікуліч. – Мінск : Літ. і мастацтва, 2012. – 336 с.

*А. Г. Міхалевіч (Беларусь)*

# КАНТЭКСТУАЛЬНАЯ НЕПАЎНАТА ЯК МОЎНАЯ АДМЕТНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ НА ВАЕННУЮ ТЭМУ

Бясспрэчным з'яўляецца той факт, што ва ўсе часы, і асабліва зараз, у Год гістарычнай памяці, мы павінны захоўваць памяць пра найбольш значныя падзеі ў жыцці роднай Беларусі, на долю якой выпала шмат выпрабаванняў і пакут. Вядома таксама, што найбольш жудаснай стала для нашай Радзімы Вялікая Айчынная вайна, мужныя паводзіны ўдзельнікаў якой і сёння застаюцца прыкладам для нашчадкаў. Разам з тым, апошнія маюць магчымасць усвядоміць подзвіг герояў на фронце і ў тыле, перажыць жудасныя хвіліны акупацыі перш за ўсё са старонак мастацкіх твораў вядомых беларускіх пісьменнікаў, многія з якіх самі сталі ўдзельнікамі гэтых падзей. Так, В. Быкаў, І. Шамякін, І. Пташнікаў, І. Навуменка, А. Куляшоў, П. Панчанка і іншыя аўтары, у тым ліку і юбіляры 2022 года, рэальна і па-мастацку праўдзіва апісваюць у мастацкіх тэкстах ваеннае ліхалецце, выкарыстоўваючы пры гэтым разнастайныя, у тым ліку і сінтаксічныя, моўна-выяўленчыя сродкі. Да ліку апошніх адносяцца параўнальна частыя няпоўныя канструкцыі, у якіх фармальна не выражаны тыя ці іншыя кампаненты структуры, неабходныя ў граматычных ці семантычных адносінах, што кампенсуецца сродкамі мікра- і макракантэксту, а таксама сітуацыяй выказвання. Для абазначэння такіх сінтаксічных